# Абрадавая замалёўка “Тлусты чацвер”

Стала ўжо добрай традыцыяй у АКіВЧ в.Гродзі святкаваць “Тлусты чацвер”. У гэты раз гасцямі абрадавай замалёўкі сталі наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылого ўзросту ДУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна”, жыхары вёсак суседняга Астравецкага раёна і, канечне, мясцовыя жыхары.

Тлусты чацвер – першы дзень апошняга “сытнага” тыдня перад Вялікім пастом. Акрамя шматлікіх тлустых і мясных страў адным з сімвалам свята з’яўляюцца пончыкі і хрушчы. Традыцыйна ў гэты перыяд часу ладзяцца танцы, а таксама вясёлыя і гучныя гульні.

Не пакінула гасцей без забаў і гаспадыня свята – заведучая АКіВЧ Станіслава Тамашэвіч. Разам з памочніцай Дзіянай Бенадысюк і народным ансамблем народнай песні “Жытніца” з аг.Кракоўка правялі цэлую забаўляльную праграму з песнямі, гульнямі і танцамі.

Мерапрыемства скончылася чаяваннем са здобай і выпечкай. Лічыцца, што чым больш з'есці пончыкаў, тым шчаслівейшы будзе чалавек.





